Весткі й Паведамленьні

інфармацыйны бюлетэнь Згуртаваньня “ПАГОНЯ”

Viestki j Paviedamlenni

Сусьветнае сеціва: ***www.baza-belarus.org, e-krama.com***
Электронны адрас: ***viestki@mail.com***
✉ ***P. O. Box 572, New York, NY 10313***

№ 4 (554)
Красавік 2012 г.

Мітынг на Мангэтане



Здымак А. Дубавой.

У суботу, 24-га сакавіка, Беларуска-Амэрыканскае Згуртаваньне “Пагоня” разам зь Беларускім Маладзёвым Рухам Амэрыкі зладзілі насупраць штаб-кватэры ААН у Нью-Ёрку мітынг, прысьвечаны 94-м угодкам абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі. Беларусы, што прыехалі з розных куткоў краіны ўжо па традыцыі сабраліся на гэтым месцы разам, каб адсьвяткаваць найвялікшае нацыянальнае сьвята – Дзень Незалежнасьці Беларусі – Дзень Волі.

Сярод больш чым сямідзесяці асобаў

Заканчэньне на бач. 11

25-га Сакавіка ў Нью-Брансўіку

Сьвята 25-га Сакавіка было супольна адзначана Беларуска-Амэрыканскім Задзіночаньнем у Нью-Джэрзі й Беларуска-Амэрыканскім Згуртаваньнем “Пагоня”. У царкве Маці Божае Жыровіцкае БАПЦ у Гайлэнд-Парку ля Нью-Брансўіка была адслужаная сьвятаром а. Зяновім паніхіда па палеглых змагарах Беларусі, а затым адпраўлены малебен за Беларусь і беларускі народ. А. Зянові павіншаваў беларусаў з нацыянальным сьвятам.

У гатэлі Гаят-Рыджэнсі ў Нью-Брансўіку адбыліся ўрачыстая акадэмія, сьвяточны банкет і канцэрт у гонар Дня Волі – 94-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі. Прагучэў амэрыканскі гімн у прачуленым выкананьні сп-ні Вольгі Казак. Імпрэзу адкрыў прывітальным словам і малітваю гіерарх БАПЦ Уладыка Сэрафім, япіскап Нью-Ёрскі й Віленскі, які павіншаваў прысутных з нацыянальным

Заканчэньне на бачыне 3



Кангрэсмэн Ф. Пэлоўн.

Сакавіцкі сход Згуртаваньня “Пагоня”

У Доме Маракоў на Мангэтане 10 сакавіка прайшоў чарговы сход Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “Пагоня”. Напачатку сходу перад прысутнымі выступіў старшыня “Пагоні” Віталь Зайка. Ён спыніўся на падзеях у Беларусі за апошні месяц і зьвязаў падзеі ў Беларусі й сьвеце з падзеямі й тэндэнцыямі, якія назіраюцца сёньня ў Амэрыцы. У прыватнасьці былі ўзгаданыя канфлікт з прадстаўніцтвамі Эўразьвязу й Польшчы ў Менску, перасьлед апазыцыі, галадоўка пакутніка за нацыянальны сьцяг Сяргея Каваленкі ды іншыя. Прамоўца таксама распавёў пра мітынг, які “Пагоня” правяла каля Аб’еднаных Нацыяў на Мангэтане ў падтрымку палітзьняволеных у Беларусі. Ён заклікаў прысутных пашыраць інфармацыю пра імпрэзы і дзейнасьць “Пагоні” сярод сяброў і знаёмых.



Затым пачалася тэматычная частка сходу, прысьвечаная набыцьцю адукацыі ў ЗША. Гутарка гэтая была падрыхтаваная сп. Яўгенам Барысевічам, сябрам управы “Пагоні”, з удзелам трох асобаў, што атрымалі амэрыканскую адукацыю або цяпер навучаюцца ў сыстэме вышэйшай адукацыі ЗША.

Гэтымі асобамі былі студэнтка ФІТ-Інстытуту Модных Тэхналёгіяў сп-ня Яўгенія Гаўрыш, спэцыяльнасьць – дызайн моды; юрыст і выпускнік юрыдычнай школы пры Сытан Гол-унівэрсытэце (Нью-Джэрзі) сп. Яўген Вайткевіч; палітоляг, які атрымаў мастар-дыплём у Нью-Ёрскім унівэрсытэце (NYU), сп. Ільля Куніцкі. Прэзэнтанты распавялі пра сябе, узгадалі, чаму вырашылі паступіць менавіта па абранай спэцыяльнасьці ў менавіта абраную ўстанову. Яны падрабязна адказалі на пытаньні прысутных і далі парады па выбары кірунку кар’еры. Сярод прагучэўшых пытаньняў, на якія былі дадзеныя адказы, былі, між іншага: умовы і неабходныя дакумэнты для паступленьня, пераход з аднае ўстановы ў іншую, пэрспэктывы для паасобных спэцыяльнасьцяў, магчымасьці для атрыманьня стыпэндыяў і шмат іншых. Інфармацыя была з увагаю й цікавасьцю выслуханая прысутнай моладзьдзю.

Наступнаю тэмаю для гутаркі на іншым сходзе можа стаць пытаньне аб працы ў ЗША – у пляне кар’еры й бізнэсу.

У разьдзеле “Рознае” прагучэлі аб’явы і паведамленьні. Сп-ня Валянціна Якімовіч паінфармавала пра маючую адбыцца імпрэзу “Гуканьня вясны”, а сп. Мікалай Сагановіч распавёў пра беларускія цэрквы ў рэгіёне Нью-Ёрк – Нью-Джэрзі і заклікаў далучацца за беларускай духовасьці, наведваць і падтрымліваць свае цэрквы.

Віталь ЗАЙКА

На здымку: Яўгенія Гаўрыш, Яўген Вайткевіч, Ільля Куніцкі.

Гуканьне вясны на беразе Гудзона

У нядзелю, 18-га сакавіка, у мястэчку Осэнін недалёка ад гораду Нью-Ёрку на беразе ракі Гудзон, адбыўся народны абрад Гуканьня вясны.

Усіх, хто захацеў падтрымаць гэтую народную традыцыю, сардэчна вітала спадарства Лены і Пятра Рыжых. Гаспадыня сьпякла больш двух сотняў бліноў, прыгатавала іншыя прысмакі, што лічацца традыцыйнамі для гэтага дня. Свой унёсак у падрыхтоўку зрабіла і маладшае пакаленьне Рыжых, тры хлапчукі зрабілі для кожнага ўдзельніка вясновага жаўрука – сымбаль пачатку вясны.

Таксама арганізатары прыдумалі і сваю традыцыю – на пудзіла зімы, ляльку Марэну, яны прапанавалі прычапіць паперкі з напіса-

Заканчэньне на бачыне 12



Здымак А. Дубавой.

25-га Сакавіка

Працяг з бачыны 1

сьвятам і асабліва падкрэсьліў важнасьць захаваньня мовы і традыцыяў.

Напачатку імпрэзы слова ўзяў сп. Юрка Азарка, старшыня аддзелу БАЗА ў Нью-Джэрзі. Ад імя сяброў аддзелу ён павіншаваў прысутных зь Днём Волі – 25-га Сакавіка, пажадаў добрага здароўя і сілаў для працы на карысьць беларускай грамады і Бацькаўшчыны. Прамоўца адзначыў, што цяпер за кратамі знаходзіцца шэраг дзеячоў апазыцыі, становішча якіх і ўмовы ўтрыманьня рэжым наўмысна робіць усё горшымі. Мы мусім адстаяць гэтых людзей, і магчымым крокам магла-б стаць сэрыя дэманстрацыяў перад амбасадаю Беларусі ў Вашынгтоне, а таксама сустрэчы з прадстаўнікамі адміністрацыі, кангрэсмэнамі й сэнатарамі.

Была зачытаная дэклярацыя губэрнатара штату Нью-Джэрзі Крыса Крысты. Затым Ганнай Грышкевіч быў прачытаны па-ангельску тэкст Трэцяй Устаўнай Граматы Рады БНР ад 25-га сакавіка 1918 году, што абвесьціў незалежнасьць Беларусі і вызначыў Беларусь, як вольную Рэспубліку ў беларускіх этнаграфічных межах.

У міжчасе ўдзельнікі імпрэзы маглі пакаштаваць стравы буфэту і выпіць віна і чаго мацнейшага за найгалоўнае беларускае нацыянальнае сьвята, памянуць змагароў, "што пайшлі паміраць, каб жыла Бацькаўшчына".

Затым з прывітаньнем да прысутных і да ўсёй беларускай грамады выступіў кангрэсмэн ад Нью-Джэрзі Фрэнк Пэлоўн. Ён павіншаваў беларусаў з нацыянальным сьвятам і адзначыў, што ягоная сям'я таксама мае сувязь зь Беларусьсю: швагерка сп. Пэлоўна – беларускага паходжаньня, а нявестка нарадзілася ў Беларусі. Кангрэсмэн падкрэсьліў, што ён разам з калегамі працягвае працу ў Кангрэсе, каб разьвіцьцё сытуацыі ў Беларусі заставалася ў полі ўвагі амэрыканскага грамадзтва і афіцыйных прадстаўнікоў, каб ціск на рэжым Лукашэнкі ўзмацняўся, з тым каб дапамагчы апазыцыйным сілам у змаганьні супраць дыктатуры. "Беларусь можа і павінна зрабіцца свабоднаю і далучыцца да сям'і вольных народаў". Сп. Пэлоўн нагадаў аб зьмене межаў свайго выбарчага ўчастку і заклікаў распавядаць пра ягоную дзейнасьць сваякам і знаёмым, каб тыя ведалі, што галасуючы за яго, яны будуць галасаваць за дапамогу для Беларусі.

У перапынках між выступамі прамоўцаў трыё сям'і Казак, у складзе Валянціны Пархоменкі, Алеся Казака і Вольгі Казак, засьпявалі патрыятычныя песьні: "Пагоню" на словы М. Багдановіча і песьню "Белая-Белая". Затым сябра Беларускага Маладзёвага Руху Дзяніс Талпека, як прадстаўнік моладзі падзяліўся з прысутнымі сваімі думкамі й пачуцьцямі адносна сьвята Дня Волі.

Затым з прывітаньнем ад Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня "Пагоня" (былы Нью-Ёрскі аддзел БАЗА) выступіў ягоны старшыня Віталь Зайка. Ён павіншаваў прысутных са сьвятам і адзначыў, што важна не забывацца пра супрацоўніцтва паміж усімі беларускімі арганізацыямі, хоць у гэтай справе не заўсёды ёсьць шмат падставаў для аптымізму, але працаваць і спрабаваць трэба, і гэта мусіць быць асноўным кірункам працы поруч з захадамі па дапамозе Бацькаўшчыне. Сп. Зайка прачытаў віншаваньні ад Старшыні Рады БНР Івонкі Сурвілла, Старшыні Беларускага Народнага Фронту Зянона Пазьняка, Згуртаваньня Беларусаў Сьвету "Бацькаўшчына". Прагучэлі прывітаньні ад сэнатараў Фрэнка Ляўтэнбэрга і Робэрта Мэнэндэса, кангрэсмэна Крыса Сьміта, зачытаныя сп. Сьвятавітам Сокалавым. Напрыканцы акадэміі была прынятая рэзалюцыя ўдзельнікаў сьвяткаваньня .

Потым прайшоў сьвяточны канцэрт, у якім узялі ўдзел Валянціна Пархоменка, Алесь Казак і Вольга Казак, а таксама муж Вольгі, Каан Анлар, па нацыянальнасьці турак, які цудоўна выканаў песьню "Купалінка". Вольга, распавядаючы пра мужа, падкрэсьліла, што ён сам захацеў вывучыць беларускую мову – і, па словах Вольгі, "калі ўжо турак можа вывучыць беларускую мову, то чаму беларусы ня могуць вывучыць сваю ўласную мову?" Дарэчы, Вольга выканала некалькі сваіх новых песень, у тым ліку "Спытай у неба" і "Край беларускі", а таксама свае ўсім вядомыя хіты "Белая-Белая", "Чыстая-Сьветлая", якія выклікалі гарачы водгук у прысутных. Вольга, як і яе бацькі, Валянціна і Алесь, надзвычай эмацыйна і ўзьнёсла правялі канцэрт, выклікаўшы падзяку і розгалас у прысутных на імпрэзе.



Вольга Казак.



Лявон Вольскі.

З праграмаю старых і новых твораў на канцэрце выступіў славуты музыка Лявон Вольскі. Напачатку выступу ён павіншаваў удзельнікаў імпрэзы і выказаў спадзяваньне, што некалі дзень 25-га Сакавіка стане сьвятам без мітынгаў і змаганьня, як дзень сьв. Патрыка, "калі можна будзе піць белае, чырвонае і зноў белае віно і радавацца сапраўднай свабодзе і незалежнасьці". Пачаўся выступ песьняй "Я нарадзіўся тут", затым прагучэлі песьні з славутага "Народнага альбому". Усе падпявалі цёплай, хатняй песьні "Простыя рэчы", а таксама песьням "Паветраны шар", "Тры чарапахі". Адбылася прэм'ера песьні "Воля героя – доля героя". Прысутная моладзь скакала каля сцэны, эмацыйна ўспрымаючы зьмест і мэлёдыі песень.

Затым перад прысутнымі выступіў знакаміты паэт і бард Сяржук Сокалаў-Воюш, цёпла сустрэты прысутнымі. Ён выканаў свае слынныя песьні "Беларусь мая" (Аксамітны вечар), "Сьвятая Ганна" ды іншыя запамінальныя творы. У завяршэньне імпрэзы прагучэла песьня-гімн "Магутны Божа" ў выкананьні сп. Алеся Казака.

Шматлікія ўдзельнікі імпрэзы былі апранутыя ў нацыянальныя строі, якія даглядае і рыхтуе для нацыянальных імпрэзаў сп-ня Валянціна Якімовіч. У фае была выстаўлена экспазыцыя мастацкіх твораў скульптара і мастака Алеся Шатэрніка і ягонай дачкі Юліі. Сп-ня Люба Карпава прадставіла на агляд свае творы – вышываныя іконы.

На імпрэзе прысутнічала больш за 100 удзельнікаў, і ўсе ў адзін голас адзначалі яе добрую падрыхтоўку і цудоўныя выступы ўдзельнікаў канцэрта, а таксама пажадалі, каб такія імпрэзы праводзіліся часьцей. Падзяка за дагляд фінансавых пытаньняў і кветкоў належыцца сп. Янку Грышкевічу, а за складаньне праграмы й агульнае кіраваньне — старшыні БАЗА ў Нью-Джэрзі Юрку Азарку.

Віталь ЗАЙКА

Здымкі Алены Дубавой.

Асінавы кол

Ужо чацьвёрты месяц ідзе драматычнае змаганьне Сяргея Каваленкі ў турме з антыбеларускай квазі-судовай сістэмай зьдзеку над чалавекам. Становішча яго крытычнае. Сяргей можа памерці ад голаду. Але праўда, годнасьць асобы і гонар Беларусі для яго найвышэй.

Партыя КХП – БНФ у гэтай складанай і цяжкай сытуацыі шмат клопату ўзяла на сябе, імкнучыся ўратаваць жыцьцё Кавленкі. (Тут і юрыдычнае забесьпячэньне, і аплата, і складаньне папер, і матэрыяльныя праблемы, і інфармацыя, і палітычныя пытаньні, і дачыненьні зь сям'ёй, транспарт, пражываньне, збор сродкаў і інш.) Натуральна, што пра такія рэчы без патрэбы не гавораць. Тым больш, што мы разумеем неабходнасьць дапамогі.

Усіх нас, фронтаўцаў, трохі зьдзіўляла тут доўгае маўчаньне дрэняў. Што б гэта значыла? Ці ўжо кантора здохла?

Аж вось яны, нарэшце, жывыя курылкі, вылезьлі з падваротні. "Партыя КХП – БНФ сошла с ума", – піша нейкі троль пад псэўданімам "снов" у інтэрнэтным выданьні "Народнай Волі", – стварылі, маўляў, "манаполію на Каваленку".

І колькі разоў мы ўжо ад іх такое чулі: і пра нашу "манаполію на Курапаты", і на "незалежнасьць", і на "Слуцкі збройны чын", на "Нацыянальную ідэю", і г. д. Словам, на ўсё тое, што ў значнай ступені, дзякуючы якраз нам, існуе і жыве. Дрэняў ад гэтага аж курчыць. Фронт, бачыце, перашкаджае ім любіць "Белоруссію". Закранулі мы тут неяк грантавую публіку (былі б давольныя, што ўспомнілі) за пустаслоўе ды імітацыю. І вось, на табе: "партыя звар'яцела".

Зрэшты, калі меркаваць па ўзроўню гэтых пісараў, то для іх мы, і праўда, – "вар'яты". Будучы па колькасьці дэпутатаў у 10 разоў меншымі за камуністаў, мы паперлі на іх у парлямэнце і вырвалі незалежнасьць краіны. (Ну, ці не вар'яты!) Ня маючы сродкаў абаранілі ад разбурэньня і стварылі Народны Мэмарыял Курапаты. Наш чалавек, будучы ў акупацыйнай лукашысцкай турме, гатовы на сьмерць за Беларускі Сьцяг (а рэальна – за сымбаль Беларускага Сьцягу). Ну, ці ж не вар'яты! Вар'яты. Ды такія, што мы яшчэ загонім асінавы кол ў гэты антыбеларускі рэжым, а заадно і ў ягоную падстаўную апазыцыю, вылавім таксама ўсіх дрэняў, гансвікаў і троляў, зробім зь іх выставу ў Менску насупроць КГБ.

Каваленкаў ёсьць шмат у Беларусі. Цярпеньне ўжо лопае і скора нашыя беларускія Бел-Чырвона-Белыя сьцягі запалымнеюць па ўсёй краіне.

Зянон ПАЗЬНЯК

Фальшывыя

Глуханямы "пратэст". Памятаем, як колькі гадоў таму некалькі разоў у сталіцы і на правінцыі пракатвалася хваля "новай апазыцыйнай моды" – гэтак званыя "флэшмобы" (або як назвалі гэтую прафанацыю патрыётыфронтаўцы, "мобы-шмобы"). Па сьвістку з-за рога на гарадзкой плошчы зьбіраліся па 30-50 маладых людзей. Ва ўсіх былі напружаныя твары (людзі павінны былі здагадацца, што яны выконваюць нейкую "сьвяшчэнную місію"), ніякіх плякатаў, ніякіх заклікаў або сымболікі. Мобшмобшчыкі сядалі на брук і разам пілі ваду з пляшак (выразы твараў усё такія ж "місіянэрскія"). Праз 15 хвілін усе ўставалі і разыходзіліся. Потым "незалежныя дэмСМІ" паведамлялі нам, што "маладыя героі нагадалі пра палітычных вязьняў, якія ня маюць вады ў турмах").

Найбольш расьсьмяшыў беларускае грамадзтва "моб-шмоб", зладжаны "героямі" ў Гомлі. Яны сядзелі на прыпынках грамадзкага транспарту, маўчалі і дэманстрацыйна чыталі бальшавіцкую газэту "Товарищ" і брашурку пра Канстытуцыю РБ. Гэты маразм павінен быў азначаць "барацьбу за свабоду друку". Беларусы пачалі высьмейваць арганізатараў і ўдзельнікаў такой прафанацыі пратэсту, і гэтая псэўдаапазыцыйная форма неяк раствырылася. Летась правакатарам удалося падняць тысячы людзей на т. зв. "маўклівыя пратэсты" – зноў без сымболікі і сэнсу. Людзі проста хадзілі па вуліцах, пляскалі ў ладкі і тупалі нагамі, а паліцэйшчынагэбоўшчына іх зьбівала і арыштоўвала. І гэтая прафанацыя правалілася.

Але прафанацыйная часотка жыве і часам нагадвае пра сябе. 8 сакавіка Радыё Свабода паведаміла нам, што жыхары Віцебску ўбачылі трох маладых людзей, якія трымалі ў руках сьцяг Эўразьвязу і плякат "Свабоду палітвязьням". На здымку Радыё Свабода паказала гэтых "герояў". Плакат у іх быў на мове акупантаў – "Свободу политзаключённым", выявы іхных твараў былі зарэтушаваныя. Радыё паведаміла, што "стаялі яны нядоўга" – гэта значыць, што "героі" сфатаграфаваліся і адразу ж разьбегліся. Вось такая "евроакцыя" ў горадзе, дзе сапраўдны народны герой Сяргей Каваленка ўзьняў над акупаванай Беларусьсю наш сьвяты нацыянальны Бел-Чырвона-Белы Сьцяг. Але камусьці вельмі важна, каб прафанатары засьвяціліся ў Віцебску з чужой сымболкай і на чужой мове.

Псэўдаапазыцыйная дзейнасьць (дакладней: імітацыя дзейнасьці) – зьява шматжанравая і нават "шматгранная". Тут ёсьць і свой "інтым" у стылі "Плэйбою". Кіруе "інтымам" такая Вольга Карач, фотапартрэт якой даволі часта ўзьнікае на сайце Радыё Свабода. 8 сакавіка Карач прадстаўляла свой чарговы праект – каляндар з эратычнымі выявамі маладых дзяўчат. На фота ў календары дзяўчаты ляжаць у пасьцелях, абдымаюцца з паўаголенымі хлопцамі і г. д. І гэта таксама пратэст, ды яшчэ які! Усе 12 "плэйбояк", аказваецца, "былі патрапілі пад арышт за ўдзел у пратэсьце пасьля выбараў 2010 году". І вось цяпер яны так пратэстуюць (зноў, дарэчы, усё ў календары на мове акупантаў)...

В. Карач падаецца ў "дэмСМІ" ў якасьці кіраўнічкі грамадзкай кампаніі "Наш дом". У Смаленску гэтая "кампанія" нават друкуе сваю газэтку пад тым жа назовам і возіць яе на Беларусь. На вокладцы нумара – знаёмы фотапартрэт В. Карач. Пра яе напісана таксама, што яна атрымлівае "второе высшее образование в Москве", "председатель витебской областной организации ОГП" і пададзена іншая рэкламная тытулатура. На старонках газэткі – савецкі плякат зь непаўторнай выявай і дэвізам "Депутат – слуга народа". Вядомы псэўдаапазыцыянэр-бальшавік тав. В. Шчукін дае шматслоўныя парады аб тым, як "нужно эксплуатировать депутатов". І ў гэтым стылі выкананы ўсе тэкстоўкі, з адзінай мэтай – прадэманстраваць легальнасьць лукашыстоўскай псэўдапарляманцкай, псэўдапрадстаўнічай сыстэмы. У агэпэшна-бальшавіцкай публікі ёсьць на гэта і грошы, і рэкляма ў "дэмСМІ".

Каб пабачыць гэтую публіку зблізу і ў арыгінале, раім вам зьезьдзіць у Вільню. Мы зьезьдзілі на дзянёк і пабачылі. Перад гістарычным будынкам віленскай ратушы дзьве маладыя асобы крыкліва абмяркоўвалі нешта па-расейску. Глядзім, а гэта згаданая В. Карач зь нейкім кавалерам. Яны пачуваюцца ў Вільні "как дома". Вось такі "Наш дом". Грантаўская публіка актыўна тусуецца ў нашай старой сталіцы. У асноўным вакол такіх асяродкаў, як "Белсат", "ЭГУ" і на розных радыё. Увечары іх можна сустрэць у электрычцы на Менск. Яны дэманстрацыйна голасна гамоняць між сабой па-расейску, твары самазадаволеныя. Яны "адбалалаілі" свой грант на беларускай мове і цяпер могуць расслабіцца, не прыкідвацца і парадавацца свайму камфорту. Глядзець на іх і слухаць іх, прызнацца, даволі брыдка. Так заўсёды бывае ў зносінах з фальшывымі людзьмі. Але самае галоўнае – вынік таго, што яны робяць: псэўдаапазыцыйная балбатня, дэзарыентацыя беларускага грамадзтва, фармальна нізкая, нікчэмная якасьць іхнай прадукцыі.

Мінае час, шмат што адчыніцца, будзе праведзена люстрацыя, якая дазволіць убачыць, адкуль усё гэта ўзялося, і як яно так доўга камфортна існавала.

Алесь ХАДАСЕВІЧ

Сцэны з жыцьця пры позьнім лукашызме

Цыркуляр па зьнішчэньні мовы

13 сакавіка ў інтэрнэт-прасторы грымнула "сэнсацыя". Быў апублікаваны тэкст "служебной запіскі", дзе "во исполнение поручений Главы государства" першы намначальніка "адміністрацыі прэзыдэнта" А. Радзькоў просіць берасьцейскае абласное начальства "принять конкретные меры по недопущению проведения руководителями государственных органов, иных организаций политики принудительной белорусификации и искусственного сокращения русского языка в их деятельности".

А ўласна ніякай сэнсацыі ў гэтым і няма. І "Глава государства", і Радзькоў, і лакальнае начальства – усё гэта ёсьць акупацыйныя структуры, якімі кіруе ўласна не "Глава государства", а Масква. Іхная задача – зьнішчэньне ўсяго беларускага: мовы, культуры, дзяржавы, народу, нашай беларускай цывілізацыі. Кур'ёзныя толькі лексічныя абароты "запіскі". Нешта мы ня чулі, каб на Берасьцейшчыне чынавенства займалася скарачэньнем рускасьці. Звычайнае чынавенства, халуйскае на абласным узроўні. Пасьля краху антыбеларускага рэжыму злачынная палітыка русіфікацыі будзе тэрмінова разгромлена. Няхай тыя, хто цяпер актыўна ажыцьцяўляе яе на практыцы, не разьлічваюць на чыноўніцкія кар'еры ў вызваленай Беларусі.

"Прыехаў ОМОН і разагнаў людзей"

Ужо каля месяца ў менскім мікрараёне Уручча-2 адбываюцца народныя пратэсты. Людзі даведаліся, што паміж іхнымі шматпавярховымі дамамі пачалі будаваць яшчэ адзін шматпавярховы дом на невялічкай тэрыторыі, дзе жыхары паркавалі свае машыны і шпацыравалі зь дзецьмі. Імпэту выступам дадала інфармацыя аб тым. што ў дом засеяляць службоўцаў з лукашэнкаўскага спэцназу. Але беларусам ня хочацца жыць побач з рэжымнымі дзяржымордамі, яны іх бачыць ня хочуць. Хопіць ім мясцовай шпаны. Аднак ніхто ня стаў слухаць людзей. Будаўнікі паставілі плот і пачалі будаўнічыя працы. 14 сакавіка людзі вывесілі на сваіх балконах транспаранты "Стройке нет!" і сабраліся каля будпляцоўкі. Яны павалілі плот і прымусілі спыніцца бульдозэры. Прыехаў ОМОН і разагнаў людзей. Пажарнікі паздымалі з балконаў транспаранты.

Ва ўмовах аўтарытарнага антыбеларускага маразму такі пратэстны выступ – зьява экстраардынарная. Пратэст адбываецца на местачковым узроўні, з выкарыстаньнем мовы акупанцкага рэжыму. Але назіраюцца пэўныя парасткі чалавечай салідарнасьці і ідэнтыфікацыя ня толькі агульнай мэты, але і агульнага ворага, якім ёсьць рэжым. Хто ведае, ці пасьпеюць нашы грамадзяне з гэтай першай прыступкі падняцца да вышэйшага ўзроўню – нацыянальна-вызвольнага супраціву? Можа і не пасьпеюць, бо рэжым вядзе сваю зьнішчальную працу вельмі інтэнсіўна, Масква і Лукашэнка сьпяшаюцца гробіць усё беларускае. А грамадзяне заўважылі гэта толькі тады, калі пачалося ўграбленьне іхнай бліжэйшай жыцьцёвай прасторы. Важна, каб нашы людзі зразумелі – на зьнішчэньні ўручанскай пляцоўкі антыбеларускі рэжым ня спыніцца. Каб людзі зрабілі з гэтага высновы.

"Мест нет"...

З прыходам вясны пачынаецца сэзон адпачынкаў і курацый. Беларусы пасунуліся ў турыстычныя бюро і інфармацыйныя цэнтры, спадзяючыся адпачыць-падлячыцца на Нарачы, у бароўскім лесе і ў іншых прыгожых мясьцінах нашай Радзімы. А ім адказваюць: "Мест нет"... Аказалася, што яшчэ летась, заранёў усе лепшыя і нават сярэдняй якасьці курорты і дамы адпачынку выкуплены "дорогімі россіянамі". Для гэтай публікі цэны ў нашых санаторыях сьмешна нізкія, а абслуга і ўсё астатняе непараўнальна вышэйшыя, чым у Расеі. Вось і апынуліся ў чарговы раз беларусы "гасьцямі" на сваёй уласнай зямлі. Нават людзі, не заўважаныя раней у праявах тэмпэрамэнту, гукаюць цяпер і ня крыюцца: "Маскалі праклятыя! Расеі ім мала! Панаехалі ў Беларусь! Ненавіжу, ненавіжу!"

Трэба патлумачыць такім людзям, што ня трэба ненавідзіць нікога. Проста трэба ведаць, з кім і з чым маем справу – на нашай зямлі (якая фактычна ня мае мяжы з мафійнай і дурной Расеяй) гаспадараць маскоўскія чужынцы, гаспадараць нахабна і расьперазана. Каб гэтага не было, ня трэба нянавісьці. Проста трэба навесьці парадак на ўласнай тэрыторыі, дзе галоўным павінен быць грамадзянін Беларусі, беларус. Трэба ўсталяваць мяжу з мафійным і дурным суседам і адбудоўваць нашу эўрапейскую цывілізацыю. Тады будзе, дзе беларусам і працаваць, і адпачываць.

Чакаюць дэнамінацыі

Беларусы паслухалі лукашыстоўскае начальства і ўстрывожыліся. 14 сакавіка ў рэжымнай газэце "Рэспубліка" выступіла кіраўнік Нацбанка РБ Н. Ермакова. Яна заявіла сярод іншага: "При той девальвации, которая у нас была в прошлом году, сегодня пока о деноминации говорить нельзя. Надо восстановить целиком экономику, денежно-кредитную систему всю привести в порядок, тогда можно будет говорить о деноминации!"

Людзі ўспомнілі, як Лукашэнка шумеў – "у нас нет крізіса". А тут, аказваецца, ужо трэба "восстановіть целіком экономіку". Як вядома, аднаўляць цалкам можна толькі тое, што грунтоўна разбурана або пашкоджана. Веры ў аптымістычныя заявы афіцыёзу ў беларусаў ужо няма. Нашы людзі заўважылі іншую тэндэнцыю і іншае правіла гульні рэжыму супраць Беларусі. Што б ні заявілі бонзы рэжыму – усё будзе з дакладнасьцю да наадварот. У выніку людзі чакаюць дэнамінацыі, якая нанясе чарговы ўдар па сотнях тысячаў сем'яў.

"Я с ужасом думаю"

Сярод беларусаў у нашай краіне жыве пэўная колькасьць этнічных расейцаў. Ёсьць адмысловая катэгорыя гэтых грамадзянаў РБ. Яны захоўваюць пэўны "нэўтралітэт", ім камфортна жыць на нашай зямлі, яны і не вучацца беларушчыне ("а зачем?") і не праклінаюць яе публічна. Іх "всё устраівает" – гэткі постсавецкі "статус кво".

І вось яны зьезьдзілі ў свае расейскія губерніі на калядныя адпачынкі, паглядзелі, што там творыцца і якія там пэрспэктывы. Вярнуліся гэтыя грамадзяне ў Беларусь агаломшаныя і задуменныя. У Менску зафіксаваны адзін маналог на тэму іхнага псіхалягічнага стану пасьля наведваньня ўсходняй імпэрыі.

Да патрыёта-франтаўца падыйшла расейка, што працуе ў гімназіі, дзе навучаюцца нашыя дзеці. Раней яна "прытрымлівалася нэўтральнасьці" і не чапляла нашага чалавека. А тут вырашыла "ізліть душу". Паслухаць яе было цікава. Дама распавяла штосьці пра Расею, а скончыла маналог такім сказам: "Я с ужасом думаю о том моменте, когда в вашу страну придут мои соотечественники..." Вось як бывае. Франтавец з свайго боку запэўніў даму, што наш народ прыкладзе ўсе намаганьні для таго, каб яны не прыйшлі...

Янка БАЗЫЛЬ

26-я гадавіна трагедыі

У весь сьвет ведае пра тысячы людзей, якія загінулі ў Хірасіме і Нагасакі ад выбухаў атамных бомбаў. Прайшло ўжо 67 гадоў, а пра тое, што здарылася, памятаюць і смуткуюць. Але ў сусьветнай гісторыі была трагедыя, якая далёка перасягнула японскую па ўзроўні антрапагеннага ўмяшаньня ў экалёгію і была роўная адначасоваму выбуху 500 атамных бомбаў.

Аварыя на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі здарылася 26 красавіка 1986 году. У выніку выбуху рэактара на сотні метраў угару падняўся слуп прадуктаў гарэньня і моцны паток газавай радыёактыўнасьці. З 190 тон ядзернага паліва 90% трапіла ў атмасфэру, разьнеслася па большай частцы Эўропы. Найбольшыя выпадзеньні прыйшліся на тэрыторыі сучасных Беларусі, Расеі й Украіны. Тут ад апраменьваньня пацярпелі 8,4 мільёны жыхароў, прычым на Беларусь выпала больш за 30% усяго выкіду. Непрыдатнымі для жыцьця сталі 150 000 кв. км (для параўнаньня, плошча Грэцыі складае 131 000 кв. км) вакол месца выбуху.

Хмара радыёактыўнага попелу прайшла праз Беларусь у Летуву, Швэцыю й Шатляндыю. Швэды першымі заўважылі радыяцыю і ўзьнялі трывогу, аднак савецкія, а потым беларускія ўлады працягвалі закрываць вочы на наступствы. Хоць, напрыклад, прафэсар ядзернай энэргетыкі Васіль Несцярэнка ўжо на другі дзень пасьля выбуху, які выехаў з Масквы ў зону аварыі, патрабаваў выселіць людзей з зоны радыюсам ў 100 км ад Чарнобыльскай АЭС, ня піць забруджаную ваду і не ўжываць забруджаныя прадукты харчаваньня. Ні адно патрабаваньне прафэсара не было выканана. Беларускі ўрад рабіў выгляд, што праблема не існуе. У суседняй Украіне эвакуявалі жыхароў у першыя дні аварыі, а беларусы жылі на забруджанай тэрыторыі ў недасьведчанасьці. Радыяцыя накрыла 54 раёны Беларусі.

Ва ўсім сьвеце разумелі небясьпеку радыяцыі больш, чым беларускі ўрад. Сотні тонаў мэдыкамэнтаў, мэдабсталяваньня, прадуктаў і адзеньня прыходзіла ў Беларусь з-за мяжы. І сёньня за мяжою працягваюць успрымаць трагедыю не як далёкае мінулае, а як сучаснасьць. Эўразьвяз выдзеліў на разьвіцьцё Слаўгарадскага раёну, куды пераехалі перасяленцы з зоны адсяленьня, ужо больш за 2,5 мільёны эўра. А Швэйцарыя выдзеліла яшчэ ў 2004 годзе 2,8 мільёны швэйцарскіх франкаў на разьвіцьцё супрацоўніцтва зь Беларусьсю ў сфэры ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. І, здаецца, што замежнікі больш клапоцяцца пра здароўе ахвяраў Чарнобыля, чым беларускія ўлады, што наўмысна замоўчваюць праблемы радыяцыі.

За пэрыяд знаходжаньня на пасадзе прэзыдэнта А. Лукашэнка ў Беларусі была зьменшана колькасьць тэрытарыяльных зонаў з пэрыядычным радыяцыйным кантролем. Сёньня на моцна забруджаных тэрыторыях (ад 15 да 40 Кюры) жыве каля 140 000 чалавек, хоць у Расеі й Украіне з такіх зонаў даўно праведзена адсяленьне. Беларускія ўлады заяўляюць, што гэтыя тэрыторыі “ачысьціліся”, і заклікаюць людзей вяртацца ў небясьпечную для жыцьця мясцовасьць. Любыя спробы агалосіць інфармацыю пра шкодны ўплыў радыяцыі на здароўе жорстка спыняецца ўладамі, аж да крымінальнага перасьледу. Самы яркі прыклад – сфабрыкаваная крымінальная справа супраць былога рэктара Гомельскага мэдўнівэрсытэту Юрыя Бандажэўскага, якога асудзілі на васем гадоў турмы за хабар. На думку беларускіх і міжнародных праваабаронцаў, гэтая справа была сфабрыкаваная ўладамі, бо вынікі ягоных навуковых даследваньняў істотна разыходзіліся з афіцыйнымі дадзенымі пра наступствы выбуху на ЧАЭС.

Ад чарнобыльскай катастрофы загінула каля 200 000 і пацярпела каля 2 000 000 беларусаў, у тым ліку больш за 500 000 дзяцей. Тэрыторыя краіны стала на многія стагодзьдзі зонаю экалягічнай катастрофы. 140 000 чалавек застаюцца жыць на забруджаных тэрыторыях. На ліквідацыю аварыі было накіравана 600 000 чалавек.

Яшчэ адна найважнейшая праблема ў Беларусі – ужываньне прадуктаў харчаваньня, атрыманых на забруджаных тэрыторыях. Інстытут радыяцыйнай мэдыцыны зьявіўся ў Менску толькі праз два гады пасьля аварыі, але ўлады ніколі не зьвярталі асаблівай увагі на ягоныя рэкамэндацыі. У краіне працягвалі і працягваюць зьмешваць чыстае мяса з забруджаным. Сёньня, як і ў 90-я гады, беларусы ядуць прадукты з Чарнобыльскай зоны. Тоны збожжа і цукровых буракоў вырошчваюцца на забруджаных палях. Такія прадукты на экспарт не ідуць, а разыходзяцца па ўсёй краіне. З вырашчаных у гэтай зоне прадуктаў дазволена вырабляць нават дзіцячае харчаваньне. Такія вось прымяняюцца нормы дапушчальнага ўтрыманьня радыяцыі. Дасьледчыкі адзначаюць, што радыяцыя шкодная для арганізму ў любой колькасьці. І, нягледзячы на пэўныя абмежаваньні, беларусы набіраюць яе ў дзясяткі разоў больш дапушчальнай нормы.

Навукоўцы сьцвярджаюць, што сёньня забруджаная ўжо ўся Беларусь. Напрыклад, пры дасьледваньні вёскі ў Валожынскім раёне з 44 чалавек усё апынуліся носьбітамі радыяцыі, а ў некаторых узровень у паўтары разы перавышаў крытычны паказьнік.

Экспэрты ААН не сумняюцца, што на забруджаных тэрыторыях нельга вырошчваць прадукты харчаваньня. Яны прапануюць выкарыстоўваць гэтыя землі для вырошчваньня рапсу і вытворчасьці зь яго біяпаліва. Яго б хапіла ня толькі на патрэбы самой Беларусі, але і на экспарт лішкаў у краіны ЭЗ. Рэалізацыя гэтага праекта была б разумнейшым рашэньнем, чым будаўніцтва АЭС у Астраўцы.

Я ўпэўнены, што на сёньняшні дзень у Беларусі магчымыя таньнейшыя і хутчэйшыя шляхі атрыманьня энэргіі. Напрыклад, утылізацыя біямасы, што ўтвараецца ў сельскай і лясной гаспадарках.

Шэсьце ў памяць аб трагедыі пад назваю “Чарнобыльскі шлях” праходзіць у Менску ад 1988 году. Але ў апошнія гады ягонымі мэтамі сталі ня толькі напамін, але і спроба прадухіленьня новай катастрофы.

Беларусы, што знаходзяцца ў Амэрыцы, я заклікаю вас не маўчаць, а выказваць сваё меркаваньне датычна існуючых экалягічных праблемаў і пагрозы, якая ўзьнікае пры будаўніцтве і эксплюатацыі новай АЭС. У нас засталіся там сваякі, блізкія, сябры, і мы ня можам заплюшчваць вочы на гэтую праблему. Набліжаецца чарговая гадавіна Чарнобыльскай трагедыі, і калі, як не цяпер, трэба гучна заявіць ураду Беларусі аб недапушчальнасьці паўтарэння старых памылак. Няўжо мы настолькі безадказныя, што дазволім будаўніцтва станцыі ў зоне сэйсмічнай рызыкі ўсяго праз год пасьля выпадка на АЭС у горадзе Фукусі ў Японіі – чарговага страшнага ўроку для чалавецтва.

Я, як эколяг, аб’ектыўна ўяўляю экалягічную пагрозу і небясьпеку, што навісла над Беларусьсю. Калі праблемы радыяцыі замоўчваюцца да сёньня – мы ня можам дазволіць нават тэарэтычную магчымасьць паўтарэньня Чарнобылю.

Юры ПЯТРОЎСКІ

Памяці Герцэна



Украсавіку сёлета спаўняецца 200 год з дня нараджэньня Аляксандра Герцэна, расейскага мысьляра, пісьменьніка і палітычнага дзеяча. Для тых, хто захапіў яшчэ савецкія часы, імя Герцэна зьвязана з камуністычным афіцыёзам, прымусовым канспэктаваньнем твораў Леніна і ягоным артыкулам 100-гадовай даўніны пад гэткай жа назвай "Памяці Герцэна". У тым артыкуле з газэты "Сацыял-дэмакрат" Ленін пісаў пра "канец буржазных ілюзіяў" і "няспелую рэвалюцыйнасьць сацыялістычнага пралетарыяту". І пра тое, што "дзекабрысты абудзілі Герцэна, а той разгарнуў сацыялістычную агітацыю". Ленін залічаў Герцэна ў паплечнікі, уважаў за аднаго з папярэднікаў. Ленін зрабіў Герцэна адным з падмуркавых камянёў маючай паўстаць камуністычнай утопіі. Праз гэта дасюль у кожным горадзе і мястэчку сёнешняй постсавецкай Беларусі ёсьць, поруч з вуліцамі Савецкай і Леніна, таксама і вуліца Герцэна – ды няма вуліцы БНР або вуліцы Ластоўскага ці вуліцы Гаруна.

Між тым Герцэн насамрэч ня ідал, зашмальцаваны рытуальнымі пацалункамі, і не "прадцеча навуковага сацыялізму". Пакаленьні савецкіх навучэнцаў і студэнтаў добра ведалі Герцэнава імя па бацьку, але зусім ня мелі інфармацыі пра непрыняцьце ім Карла Маркса і ягонай усеахопнай сацыяльна-палітычнай тэорыі. Не здагадваліся пра тое, што сапраўдны, несавецкі, Герцан быў зацятым ворагам паняцьцяў "масы" і "падпарадкаваньне волі народу". Што ён быў супраць прыстасаваньня індывідуальных правоў і свабодаў да палітычным формулаў і цэнтралізаванага ціску ўлады, што ён быў, словамі ангельскага філязофа Ісаі Бэрліна, супраць "тыраніі вялікіх альтруістычных сыстэмаў".

У сваіх працах Герцэн дэталёва прадказаў мажлівыя эксцэсы ў паваротах і трансфармацыях, праз якія пойдзе змаганьне за вызваленьне чалавецтва. І недвухсэнсоўна, з усёй палкасьцю закляйміў гвалт у імя свабоды і забойствы дзеля народнага шчасьця. Наўрад ці Герцэн пагадзіўся б на сваю кананізацыю савецкім рэжымам і, хутчэй за ўсё, адхіснуўся б ад гэткіх прэтэндэнтаў у паплечнікі, як Ленін або Сталін.

Але што-ж можа даць 200-гадовы расеец Герцэн сёнешняму беларусу, сёнешняй Беларусі, чаму ён можа быць цікавым для беларускай справы?

Дзеля адвечнай наўмыснай русіфікацыі ды культываваньня расейскай ксэнафобіі, сёнешні жыхар Беларусі непараўнальна лепш абазнаны ў справах, палітыцы, гісторыі, літаратуры ўсходняга суседа, чым у сваёй уласнай. Вытручваючы ўсё нацыянальна беларускае, адкрыта ці схавана ізалюючы Беларусь ад заходніх уплываў, прарасейскія кіраўнікі савецкай і постсавецкай Беларусі пакінулі беларусам толькі расейскія прыклады, расейскія парадыгмы, расейскія паралелі ды аналёгіі для рэальнага ўжытку і апэляваньня. Таго, што адбылося, цяпер не адменіш. Ход прайшоўшых падзеяў не пераробіш. Беларусы сёньня мусяць хадзіць тымі картамі, якія раздаў ім лёс. А сярод іх, як ня дзіўна, ёсьць і казырныя.

Сярод іх ёсьць Герцэн.

Як добра паказаў у сваіх працах сьв. пам. Генадзь Кісялёў, выдаваныя Герцэнам на эміграцыі "Полярная звезда" і "Колокол" зьмяшчалі шмат матэрыялаў зь беларускіх земляў. Герцэн з сымпатыяй адгукаўся пра беларусаў, як адну з нацыянальных меншыняў Расейскай імпэрыі, і як для іншых меншыняў, зычыў ім лепшай будучыні праз дасягненьне незалежнасьці й стварэньне сваёй нацыянальнай дзяржавы. З рэдкай для расейскага патрыёта шчырасьцю і аб'ектыўнасьцю Герцэн асуджаў расейскі шавінізм і падаўленьне ім іншых народаў і культураў. Ён паставіў увесь свой аўтарытэт і публіцыстычныя здольнасьці на падтрымку паўстаньня 1863 году і нават сабраў сродкі для набыцьця зброі для паўстанцаў у Беларусі й Літве. Ён падтрымаў у "Колоколе" выдаваную Кастусём Каліноўскім "Мужыцкую праўду". Герцэн ёсьць рэдкім, нажаль, выпадкам завадатара сапраўднай, не рэтарычнай "дружбы народаў". І хіба таму гэты аспэкт ягонай дзейнасьці быў збольшага па-за ўвагай савецкіх ідэёлягаў.

Для беларускай эміграцыі выдавецкая і публіцыстычная дзейнасьць Герцэна ёсьць прыкладам магчымасьцяў для ўплыву на палітычную сытуацыю на Бацькаўшчыне, калі літаральна адзін чалавек зрабіўся магутнай супрацьвагой для ўсёй прэсы ды афіцыйнай прапаганды вялізнай імпэрыі. Калі тысячы карэспандэнтаў Герцэна ды лёнданскія візытэры да яго з Расеі паказвалі, як непадцэнзурнае слова й апінія запатрабаваныя і ацэненыя ў родным краі.

Пошукі Герцэнам шляхоў да паляпшэньня лёсу народаў Расейскай імпэрыі, улучна з самымі расейцамі, шчыра і з гранічнай адкрытасьцю адлюстраваныя ў самым буйным і вядомым творы Герцэна, ягоных мэмуарах "Былое і думы". Роздумы пра лёсы сялянства, пра перабудову грамадзтва і вызваленьне індывіду з-пад панаваньня тысячагадовай інэрцыі патрыярхальнай каставай сыстэмы ўвасобіліся ў творы, які сфармаваў лібэральную грамадзкую думку ў Расейскай імпэрыі другой паловы 19-га стагодзьдзя, у тым ліку на беларускіх землях. Уся трапяткая і няўрымсьлівая душа мысьляра і шукальніка праўды занесеная на старонкі "Былога..." ды іншых кнігаў і артыкулаў, і менавіта знойдзеная і выпакутваная праўда стала для Герцэна тою зоркаю, што правяла яго па жыцьці.

Прастуючы сьцяжыны ў будучыню, да свабоды, Герцэн ня мог прадбачыць, што ягоная творчасьць і біяграфія будуць прагматычна скарыстаныя адною з найжорсткіх таталітарных сыстэмаў у гісторыі чалавецтва. Свабода абярнулася сапраўдным калгасна-лягерным рабствам, воля купкі палітычных маніпулятараў, выдаваная за голас народу, на тры чвэрці стагодзьдзя паняволіла гэты самы народ. Але ўважлівае чытаньне Герцэна паказвае, што акурат у ягоных творах і закладзеныя непрыняцьце і суворы прысуд таталітарызму, падкрэсьліваюцца адкіданьне гвалту і прымусу ў імя імглістых утапічных абяцанак далёкай няпэўнай будучыні.

Цяжка ўявіць сабе Лукашэнку або якога Пуціна чытальнікамі кнігі Герцэна "Былое і думы". Тыранам, напэўна, шмат чаго нагадалі б некаторыя герцэнавы радкі. А наагул шкада, што ўладары не зацікаўленыя ў пошуках праўды. І Ленін быў бы зусім іншым чалавекам, каб сэрцам, а ня розумам, прыняў кнігу, не застаўся б раззлаваным, помсьлівым і саркастычным разбуральнікам; і Сталін ня стаў бы гэткім душагубам, а Лукашэнка – ворагам усяго беларускага. У пошуках Герцэна адлюстраваныя лёсы і жыцьці пазьнейшых пакаленьняў, і савецкіх людзей, і постсавецкіх, якімі дасюль заселеная яшчэ Беларусь. Не зразумеўшы іх, ня можна зразумець шляхоў да сапраўднай незалежнай Беларусі, да сапраўднай свабоды для яе. І ў гэтым разуменьні не найгоршым спадарожнікам будзе Аляксандар Герцэн.

Віталь ЗАЙКА

Наш чалавек у Ізраілі

Навукоўцаў зь Беларусі сёньня можна спаткаць бадай у любой краіне сьвету. Іншая справа, што далёка ня ўсе зь іх займаюцца Беларусьсю. Але й тых, хто ўсё ж нейкім неверагодным чынам здолеў выбудаваць сваё жыцьцё гэткім чынам, каб на вокладках працаў пазначалася “Belarus”, ведаем ня надта добра. Адзін з такіх дасьледнікаў – доктар Леанід Сьмілавіцкі, наш чалавек у Ізраілі.

Да ад’езду ў Ізраіль Вы цягам дванаццаці гадоў выкладалі ў БДУ і ўжо тады займаліся тэмаю беларускага габрэйства. Наколькі спрыяльнымі былі ўмовы для дасьледваньня?

У ВНУ я пачаў выкладаць з 1980 г. Пасьля заканчэньня асьпірантуры пры БДУ й абароны кандыдацкай (1984 г.) я паступіў на катэдру гісторыі СССР, БССР і замежных краінаў пад кіраўніцтвам прафэсара А. Грыцкевіча. Да 1991 г. адной з найбольшых праблемаў для мысьлячага дасьледніка быў выбар тэмы, бо ва ўмовах “разьвітога сацыялізму” ўсе яны былі ўжо разабраныя. Як ні дзіўна гэта гучыць, лічылася, што айчынная гісторыя (да й пасьля 1917 г.) ужо напісаная. А чаго ня было – тое не дазвалялася. Доступ у архівы быў абмежаваны, у навуковыя часапісы “падазроныя” тэмы ня бралі. Пра публікацыю за мяжой можна было толькі марыць. Гэта датычылася ня толькі гісторыкаў. Пра Глаўліт я тады толькі чуў, самацэнзура аўтара працавала бяз збою.

Якая прычына сталася падставаю эміграцыі зь Беларусі – палітычная, пабытавая, прафэсійная?

Да ведамых жнівеньскіх падзей 1991 г. я быў “дабраахвотным абаронцам” – быў такі тэрмін. Спадзяваўся, розум пераможа й зьмены да лепшага непазьбежныя. Верыў сам і пераконваў іншых. Па савецкіх стандартах у мяне было ўсё, што патрэбна: сям’я, праца ў ВНУ, кватэра, машына, дача. Але ўпэўненасьць у заўтрашнім дні я згубіў. У пэўны момант зразумеў, што калі ня зьеду, то ў маім жыцьці болей нічога не адбудзецца. Сваю ролю адыграў і Чарнобыль, пяцігадовы сын хварэў, дыягназ ніхто ня мог паставіць.

Амаль ад самага пачатку жыцьця ў Ізраілі Вы пачалі працаваць у The Goldstein-Goren Diaspora Research Center. Было складана ўладкавацца?

Больш за год я працаваў не па спэцыяльнасьці. Гэта была цяжкая некваліфікаваная праца. Трэба было вучыць іўрыт, вучыцца жыць у новых умовах. Цікава, што як чалавек сябе “запраграмуе”, гэтак у яго і атрымаецца. Першым часам было складана, пра працу гісторыкам ці наогул інтэлектуальную працу нават ня марыў. У нейкі момант здавалася, што знайсьці працу па спэцыяльнасьці – гэта як бесьсьмяротнасьць здабыць. Паколькі я яшчэ ў Менску цягам году вучыў іўрыт, дык ужо праз два тыдні па рэпатрыяцыі я працаваў. Мне спачувалі. Як вядома, чым ніжэй чалавек на сацыяльнай лесьвіцы, тым болей яму спачуваюць.



Потым Міністэрства абсарбацыі знайшло часовае месца ў Яд Вашэм. Спрацавалі тры фактары: навуковая ступень, мой век і публікацыі – далі шанец. Мы пераехалі зь Петах-Тыквы ў Ерусалім. Гэта 75 км, у Ізраілі ўсё побач. Зьнялі маленечкую кватэрку. За год працы я троху агледзеўся і ўжо меў уяўленьне пра ізраільскія архівы. Пасьпеў надрукаваць свае першыя ў Ізраіле навуковыя працы. Адну пра Менскае гета (у ангельскай мове), а другую – пра антысемітызм у партызанскім руху (на іўрыце). У міжчасе кантракт у Яд Вашэм скончыўся, і я зноў паўтары гады быў бяз працы. Чым займаўся? Зранку – чарнарабочы, увечары – бібліятэка. Потым знайшоў месца ў Тэль-Авіўскім унівэрсытэце. Спачатку на год, потым кантракт працягнулі. Пачаў рэгулярна езьдзіць у Беларусь, зьбіраць матэрыял у архівах, сустракацца з калегамі, браць удзел у канфэрэнцыях.

Раскажыце троху пра гэты Цэнтар – чым займаецца, колькі супрацоўнікаў, кім фінансуецца?

Цэнтар існуе ад 1962 г. Галоўнае ідэя – у вывучэньні гісторыі яўрэйскай дыяспары (ад прарокаў да нашых дзён). Існуюць італьянскі, турэцкі, грэцкі, румынскі, польскі, нямецкі і іншыя праэкты. Я прапанаваў беларускі. Калі ўзяць пад увагу, што шмат якія прэзыдэнты й прэм’ер-міністры, ня кажучы пра інтэлектуальную эліту Ізраілю, маюць беларускія карані, дык запатрабаванасьць тэмы відавочная. Напрыклад, першы (Хаім Вэйцман, 1874-1952), трэці (Шнеур-Залман Шазар, 1899-1973) і цяперашні (Шымон Пэрэс, 1923 г. нар.) прэзыдэнты Ізраіля, два прэм’ер-міністры: Менахем Бегін (1913-1992) і Іцхак Шамір (1915 г. нар.), стваральнік сучаснага іўрыту Бэн-Іегуда Элізэр (Лазар Юдавіч Перэльман), нарадзіўся ў вёсцы Лужкі Віцебскай губ. (1858-1922) і складальнік першага руска-іўрыт слоўніка Эвен Шошан (Авраам Разэнштэйн) (нар. у Менску, 1906-1984).

Пра працу Цэнтру можна падрабязьней прачытаць тут: *http://souz.co.il/clubs/read.html?article=2722&Club_ID=1*

Фінансуе Цэнтар дзяржава й прыватныя спонсары. Усе супрацоўнікі адначасна выкладаюць на гістарычным ці іншых гуманітарных факультэтах унівэрсытэту. Адпаведна ўкладзена й нагрузка: ад 150 да 250 гадзінаў на год. Астатні час ідзе на абнаўленьне навуковых курсаў і на навуку. Кожны мае права шукаць сабе дадатковыя гранты.

Вы там адзіны спэцыяліст па Беларусі ці ёсьць нехта яшчэ?

На акадэмічным узроўні гісторыяй Беларусі у Ізраілі займаюся я адзін. Але ёсьць некалькі калегаў, якія ў той ці іншай ступені закранаюць гэтую тэ-

му. Перш за ўсё назваў бы д-ра Аркадзя Зэльцэра, д-ра Леаніда Рэйна, д-ра Альберта Кагановіча і Данііла Раманоўскага. Гэта новае пакаленьне дасьледнікаў (усе народжаныя ў Беларусі), якія абаранілі доктарскія дысэртацыі ў Ізраілі. Але ў цэлым дасьледваньнем гісторыяй тых месцаў, дзе мы з Вамі нарадзіліся, займаюцца адзінкі. Як правіла, мы ўсе ведаем адзін аднаго.

Ці ёсьць магчымасьць дасьледчыкам зь Беларусі або, прыкладам, Амэрыкі прыехаць і папрацаваць там над сваёй тэмаю ці проста пазнаёміцца са зборамі?

Я думаю, так. Штогод Цэнтр дыяспары і ізраільскія ўнівэрсытэты, улучна з навуковымі цэнтрамі, такімі, як Яд Вашэм, аб'яўляюць конкурсы. Браць удзел могуць усе жадаючыя. Адрасы лёгка знайсьці ў сеціве.

За час працы ў Цэнтры Вы выдалі некалькі кнігаў: "Евреи Беларуси: из нашей общей истории, 1905-1953 гг." (Менск, 1999); "Катастрофа евреев в Белоруссии, 1941-1944" (Tel Aviv, 2000), "Евреи в Турове: История местечка Мозырского Полесья" (Jerusalem, 2008). Гэта плянавыя працы? Вы самі вызначаеце тэмы ці трэба ўзгадняць з начальствам, якое, як ні круці, плоціць заробак?

Гэта плянавыя працы, што цалкам адпавядаюць праекту, над якім я працую ў Тэль-Авіўскім унівэрсытэце. Тэму выбірае дасьледнік і вылучае на зацьвярджэньне навуковай рады. Далей ідзе экспэртыза, ананімнае рэцэнзаваньне, а пасьля зацьвярджэньня – фінансаваньне.

Апішыце, калі ласка, свой больш-менш звычайны працоўны дзень.

Тут нічога новага сказаць нельга. Дзень пачынаецца з кампутару і ім заканчваецца. А паміж – бібліятэка, архіў, студэнты, дактаранты, экспэртызы, абмеркаваньне працаў. Трэба знайсьці час на разбор архіўных знаходак, укладаньне вопісу дакумэнтаў (на іўрыце, па-расейску і ангельску). Расейская мова – як мова арыгіналу, іўрыт – для мясцовых карыстальнікаў, і ангельская – для зьнешняга сьвету.

Цяпер на стадыі выданьня Вашая новая кніга – "Jewish Life in Belorussia during the Final Decade of the Stalin Regime, 1944-1953". Пра што яна?

Пра рэлігійнае, культурнае, эканамічнае жыцьцё яўрэйскай грамады ў Беларусі, той яе часткі, што выжыла пасьля Галакосту. Калі ў 1941 г. яна складала 1 млн. чалавек або 10% усяго насельніцтва рэспублікі (разам заходняя і ўсходняя яе часткі плюс бежанцы з Польшчы ў 1939 г.), дык перапіс 1959 г. налічыў у БССР троху болей за 150 тыс. яўрэяў.

Але гэта не самая апошняя праца. Вы нядаўна скончылі кнігу, што нібыта стаіць троху збоку ад Вашай асноўнай тэмы, і прысьвечана цэнзуры на Беларусі. Раскажыце падрабязьней пра яе. Дарэчы, цікава, скуль зьбіраліся матэрыялы?

Мне даўно хацелася ўзяць тэму, якая б датычыла ня толькі яўрэяў Беларусі, але паказвала б гісторыю ўсёй рэспублікі цалкам. За апошнія 20 гадоў у Ізраілі я сабраў унікальную калекцыю дакумэнтаў, якія дазволілі гэта зрабіць. Пасьля таго, як я выявіў некранутыя архівы Глаўліта – "Главного управления по охране военных и литературных тайн в печати", я зразумеў, як ажыцьцявіць задуманае. Фігуральна гаворачы, савецкі рэжым трымаў краіну ў жалезным ашыйніку з дапамогаю партыі, службы дзяржбясьпекі і цэнзуры. Якім менавіта чынам гэта адбывалася ў Беларусі, якія былі патрабаваньні да выканаўцаў, хто хадзіў у памагатых у Глаўліта? Што з сябе ўяўляла ідэалягічная, ваенная, эканамічная, палітычная, меэдыцынская, экалягічная цэнзура? Будзённае жыцьцё, пэрлюстрацыя ліставаньня, кантроль за працай выдавецтваў і друкарняў, праверка бібліятэчных фондаў, букіністычных крамаў, рэпэртуару тэатраў, эстрады, кінематографа, радыё, працы грамадзкіх арганізацыяў – Саюзу мастакоў, Саюзу пісьменьнікаў, Саюзу кампазытараў, Дзяржцырку. Арганізацыя і дзейнасьць спэцхранаў. Кантроль быў усеахопны і шматступенны.

Акрамя кнігаў, часапісаў і газэтаў існавала так званая "дробнадрукаваная прадукцыя", адметная сваёй бясконцай разнастайнасьцю. Гэта былі запрашальныя квіткі, візытоўкі, календары, запалкавыя этыкеткі, цукерачныя абгорткі, усе віды службовай дакумэнтацыі, афішы, праграмы, лібрэта і гэтак далей. Колькасьць назоваў увесь час павялічвалася, і гэта ўсё прымалася да вытворчасьці толькі з дазволу Глаўліту.

Пра сам Глаўліт пры гэтым нідзе не згадвалася – ні ў друку, ні ў даведніках. Лічылася, што цэнзура існуе толькі ў капіталістычным сьвеце. Таму працаў па гісторыі савецкай цэнзуры не было, вывучалася толькі дарэвалюцыйная цэнзура.

Савецкі цэнзар, або як яго тады называлі, палітычны рэдактар, ніколі наўпрост не сустракаўся з аўтарам, толькі праз галоўнага рэдактара. Аўтары ня ведалі, хто менавіта іх кантралюе. Савецкая цэнзура гэта цалкам засакрэціла. Абскардзіць нейкія забароны, зробленыя купюры было немагчыма – у адрозьненьне ад царскай цэнзуры, між іншага.

Матэрыялам маёй манаграфіі сталіся галоўным чынам архіўныя дакумэнты, а таксама дадатковыя зьвесткі, знойдзеныя ў навуковых і папулярных, статыстычных зборніках, пэрыёдыцы. Узбагацілі іх успаміны былых супрацоўнікаў цэнзуры і сродкаў масавай інфармацыі, друкарняў, выдавецтваў, часапісаў, пісьменьнікаў і мастакоў, якія па службовай неабходнасьці сутыкаліся з працай Глаўліту БССР. Цяпер трэба вырашаць пытаньне з пошукам сродкаў на выданьне манаграфіі.

Ня так даўна на канфэрэнцыі ў Варшаве Вы чыталі даклад пра беларусіку ў ізраільскіх архівах. Дык што хаваюць тамтэйшыя сховішчы?

Тэма майго дакладу ў Унівэрсытэце Лазарскага была сфармулявана так: "Гісторыя Беларусі, адбітая ў Ізраілі: агляд архіўных калекцый дакумэнтаў і матэрыялаў". Я падрабязна спыніўся на характарыстыцы ізраільскіх архіваў, навуковых цэнтраў, бібліятэк. Галоўнымі архівамі ў Ізраілі ёсьць: Дзяржаўны архіў, Цэнтральны архіў сіянізму, Цэнтральны архіў гісторыі яўрэйскага народу, архіў Яд Вашэм, архіў Арміі абароны Ізраілю, Архіў працы (гісторыя яўрэйскага працоўнага руху), Архіў Уладзімера Жабацінскага (гісторыя руху сіяністаў-рэвізіяністаў і яўрэйскіх падпольных арганізацый у падмандатнай Палестыне), Архіў Хаіма Вэйцмана, архівы кібуцных рухаў у Мерхавіі і Эйн-Хародзе, архівы іешываў (Мір, Валожын, Столін, Карлін, г. д.).

Важныя зьвесткі пра беларускую старонку яўрэйскай гісторыі можна бязь цяжкасьці адшукаць у Нацыянальнай бібліятэцы Ізраілю ў Ерусаліме. Ейны рукапісны аддзел зьмяшчае каля 150 *пінкасім* – летапісаў яўрэйскага жыцьця, што пісалі на іўрыце да пачатку XX стагодзьдзя грамады, дабрачынныя арганізацыі або рамесныя цэхі.

Да пачатку 1991 г. гісторыкі мелі толькі ўскосныя зьвесткі. Яны былі вымушаныя аналізаваць зьвесткі з афіцыйных савецкіх крыніцаў, успамінаў. Зацікаўленасьць да саветалёгіі была вялікаю, шчодра фінансаваліся навуковыя досьледы, друкаваліся кнігі, абараняліся дысэртацыі. З развалам СССР і доступам да архіваў склалася іншая

Заканчэньне на бач. 11

“Мае ўспаміны” Марыі Стагановіч

Пабачыла сьвет новая кніга ў сэрыі “Беларуская мэмуарная бібліятэка”. Яе аўтарка – жанчына амаль невядомая шырокай эміграцыйнай ды мэтрапольнай грамадзкасьці – жонка пасла польскага Сойму Аляксандра Стагановіча Марыя з роду Карпузэвіч-Борыс (1898—1995). Яна паходзіла зь сям’і селяніна, які служыў у маёнтках графа Храптовіча-Буцянёва, атрымала некаторую адукацыю, у тым ліку вучылася на прафэсійных курсах у Менску, перажыла Першую ды Другую сусьветныя войны і ў рэшце рэшт апынулася з мужам і дзецьмі ў Злучаных Штатах Амэрыкі. Аднак менавіта непаўторны сьвет вясковага жыцьця пачатку XX ст. на Наваградчыне і адлюстраваўся ва ўспамінах гэтай жанчыны.



Унікальны выпадак у айчыннай мэмуарыстыцы – наяўнасьць успамінаў мужа і жонкі, напісаных зусім незалежна, непадобных адных на другія зьместам, але пры гэтым абсалютна каштоўных. “Успаміны пасла” Аляксандра Стагановіча ў 2010 г. адкрылі “Беларускую мэмуарную бібліятэку”, а “Мае ўспаміны” Марыі Стагановіч сталіся яе годным працягам.

Храналягічна тэкст ахоплівае час ад канца XIX ст. да 1917 г. Тут можна знайсьці пераказы бацькоўскіх аповедаў пра дзядоў і шматлікіх сваякоў, згадкі пра падзеі дзяцінства, што прайшло ў фальварках Косава й Мураванка ды двары Нясутычы, апісаньне разнастайных народных традыцыяў і звычаяў, аповед пра навучаньне ў Менску, пачатак 1-й Сусьветнай вайны ды бежанства ў Смаленшчыну. Апошняе асабліва цікава, бо ўспамінаў пра тыя часы і падзеі засталося надзвычай мала.

Марыя Стагановіч не зьбіралася пісаць мэмуары, каб прааналізаваць ўласнае жыцьцё, або каб скласьці геараічны вобраз кагосьці зь блізкіх, што часта бывае матывам такога кшталту тэкстаў. На просьбу дачкі яна пастаралася запісаць, “як раней было ў Беларусі”, і магчыма таму яе ўспаміны часам нагадваюць аповед бабулі, цёплы, нясьпешны, з шматлікімі адыходамі і вяртаньнямі.

Напісаныя на эміграцыі “Мае ўспаміны” ня маюць аналягаў у айчыннай мэмуарыстыцы. Шчырыя, поўныя каштоўных дэталяў згадкі пра звычайнае, штодзённае жыцьцё беларускай Наваградчыны, даюць неацэнны матэрыял этнографам і гісторыкам. Уласна жыцьцёвы аповед дапаўняюць запісы песень, асаблівасьцяў мясцовых звычаяў і сьвяткаваньняў, лекавых уласьцівасьцяў розных зёлак, рэцэптаў традыцыйных страваў.

Марыя Стагановіч пакінула нам выдатнае сьведчаньне пра традыцыйны лад жыцьця і побыт нашых продкаў. Яе ўспаміны, як і ранейшыя выданьні сэрыі, публікуюцца з якаснымі камэнтарамі ды цікавымі фатаздымкамі зь сямейнага архіву і павінны стаць заўважнаю зьяваю ў беларускай мэмуарыстыцы.

Натальля ГАРДЗІЕНКА

Шаноўныя падпісчыкі!

Калі ласка, не забывайце своечасова аплочваць падпіску на “Весткі й Паведамленьні”, бо нашае выданьне цалкам залежыць ад Вашай падтрымкі й зацікаўленасьці. Нагадваем, што гадавая падпіска складае **$30.**

Памер і час апошняга ахвяраваньня на выданьне бюлетэня Вы заўсёды можаце праверыць на адраснай налепцы канвэрта, у якім яго атрымліваеце. Гэтая інфармацыя зьмешчаная справа ад Вашаг імя.

Вершы Тацяны Саланко

Незалежнасьць

На свеце розных шмат краинау,
Таксама нацый и народау.
Але для кожнага радзима
Адна, як маци, назауседы.

На мове роднай гаварыць,
Бо гэта мова матчына,
Усе што ад прадзедау цаниць,
Бо гэта наша спадчына.

Нашы дзяды жыцце аддали
За землю нашу, прыналежнасць.
Каб пакаленни святкавали
Сваей радзимы незалежнасць.

И гэта свята напамин,
Не ведаеш, чытай па вуснам:
Радзиму мы не аддадзим,
Мы Беларусь, Мы беларусы.

Мы разам заспяваем гимн,
Мы разарвем рэжыму межы.
Няхаи вядома будзе усим,
Што Беларусы незалежны!

* * *

Сьв. памяці
Ў. Кавалева і Д. Канавалава.

Царква і пахавальны звон
Па усей, здаецца, Беларусі.
Няпраўда гэта, дрэнны сон,
Але прачнуцца я баюся.

Два маладзенькія хлапцы,
Жыцьця пачатак толькі, мусіць.
Ператварыліся ў рубцы,
Рубцы на сэрцы Беларусі.

Ужо ня зьдзейсьняцца іх мары,
Судзьдзя агучыў ім прысуд –
Расстрэл, і не памілаваны
Ніхто, хто верыў у нейкі цуд.

Усе, хто мае дачыненьне,
Усе, хто выслужыўся тут,
Прасіць ужо позна прабачэньня,
Але есьць іншы, Божы суд.

І гэта ўсе невыпадкова,
Вы за пагоны, мэдалі
Прадалі душу канчаткова,
Ня змыць ужо з Вашых рук крыві.

Усё вернецца да Вас, аднойчы,
Ёсьць Бог, я веру ў Яго.
І пашкадуеце Вы тройчы,
Што расстралялі не таго.

Дзьве птушкі паляцелі ў вырай,
Свабоды Вам я пажадаю.
Хай будзе ў небе лепей, шырай,
А ўсім родным спачуваю.

Мітынг на Мангэтане

Заканчэньне з бачыны 1

былі людзі ня толькі зь Нью-Ёрку ды блізкіх да “Вялікага Яблыка” гарадкоў штатаў Нью-Джэрзі і Канэктыкута. Прадстаўніцтва ўдзельнікаў сьвяточнага мітынгу было даволіі шырокім – на акцыю прыехала моладзь з Пэнсыльвэніі – Філядэльфіі (ажно 10 чалавек), паўднёвага Нью-Джэрзі і Масачусэтсу (Бостан і Спрынгфільд).

Арганізатары выказалі шчырую падзяку ўсім, хто сустрэліся ў гэты сьвяточны дзень са сваімі землякамі ў Нью-Ёрку пад бел-чырвона-белымі сьцягамі.

Распачаў урачысты мітынг сябар управы БАЗ “Пагоня” Яўген Барысевіч. Спачатку ён павіншаваў прысутных суайчыньнікаў зь вялікім нацыянальным сьвятам. Ён распавёў аб гістарычных і палітычных падзеях часоў 1-й Сусьветнай вайны на тэрыторыі Беларусі і па-за яе межамі, якія вызначылі будучы лёс краіны. Падчас свайго выступу ён таксама зьвярнуў увагу на некаторыя падабенствы да цяперашняй сытуацыі ў Беларусі – зьвяртаньне да эўрапейскай і сусьветнай супольнасьці па дапамогу ў стварэньні свабоднай і незалежнай беларускай дзяржавы, цярплівасьць і абыякавасьць беларускага народу да парушэньняў іхніх правоў і свабодаў з боку кіруючай улады, а таксама адсутнасьць каардынацыі і адзінага пляну сярод разьяднаных апазыцыйных рухаў.

Скончыў сваю прамову Яўген Барысевіч думкаю, што няма нічога важнейшага ў жыцьці нацыі, як дасягненьне ёю незалежнасьці і стварэньне нацыянальнай дзяржавы, і 25-га Сакавіка ёсьць для беларусаў знакавай, вызначальнай датай XX–га стагодзьдзя і ўсёй гісторыі беларускай нацыі. Такая падзея ўваходзіць ў вечнасьць!

Наступным выступіў каардынатар Беларускага Маладзёвага Руху Амэрыкі Дзяніс Талпека. Ён распавёў аб сваім спадзяваньні, што ўжо праз некалькі гадоў Дзень Волі будзе ўспрымацца кожным з нас не як дзень, калі пераськедуюць нашых сяброў ды блізкіх, а можа і зусім невядомых людзей за выкарыстаньне нацыянальнай сымболікі ды за іхнюю любоў да роднай краіны. Ён распавёў аб катаваньнях лукашысцкімі ўладамі шчырага беларуса Сяргея



Здымак Д. Бачко.

Каваленкі. Спадар Талпека таксама заклікаў прысутных падтрымаць Сяргея Каваленку і ягоную сям’ю. Напрыканцы свайго выступу Дзяніс заклікаў як мага больш размаўляць па-беларуску і выказаў спадзяваньне, што “ў хуткім часе беларусы будуць адзначаць Дзень Волі не выходзячы на вуліцу ды выкрыкваючы лёзунгі, а ў сямейным коле, сярод сяброў, проста ведаючы, чым ёсьць гэты дзень для дзяржавы і кожнага беларуса”.

Даволі нечакана, без папярэдняй дамоўленасьці, да мітынга далучыўся Старшыня БНФ Зянон Пазьняк. Усе прысутныя з асаблівай цікаўнасьцю слухалі ягоную прамову. Спадар Пазьняк пачаў зь віншаваньня ўсіх беларусаў з нацыянальным сьвятам. Далей ён нагадаў аб падзеях і беларускіх дзеячах напачатку XX-га стагодзьдзя і распавёў аб неабходнасьці выкарыстаньня беларускай мовы і захаваньні беларускай культуры і традыцый, калі мы хочам дабіцца стварэньня свабоднай і незалежнай Беларусі.

Асноўная частка выступу сп. Пазьняка была адведзеная расповеду аб цяжкім стане Сяргея Каваленкі і ягонай адданай барацьбе за свае правы і свабоды. У канцы прамовы сп. Пазьняк заклікаў прысутную моладзь як мага хучэй атрымліваць тут адукацыю і вопыт працы, каб потым (калі зьменіцца ўлада) вярнуцца на Радзіму і выкарыстаць атрыманыя веды і вопыт на карысьць свабоднай Беларусі.

Усе выступы арганізатараў і ўдзельнікаў мітынгу суправаджаліся гучным скандаваньнем лёзунгаў, як на беларускай, так і на ангельскай мовах. Скончыўся мітынг традыцыйнымі агульнымі сьпевамі беларускага нацыянальнага гімну “Мы выйдзем шчыльнымі радамі” і гімну “Пагоня”.

Было прыемна, што моладзь, якая складала пераважную большасьць прысутных на мітынгу, знаходзіла новых знаёмых, навязвала новыя кантакты ды, сьмеючыся, у добрым настроі разыходзілася ў гэты даволі халодны, але па-сьвяточнаму ўзьнёслы дзень з надзеяй у лепшую Беларусь.

Яўген БАРЫСЕВІЧ

Наш чалавек у Ізраілі

Заканчэньне з бачыны 9

сытуацыя, якая дазволіла гісторыкам знаёміцца з першакрыніцамі, капіяваць шматлікія дакумэнты, прывозіць іх на захаваньне ў Ізраіль.

Хацелася б даведацца пра зарганізаванае жыцьцё былых менчукоў, пінчукоў, турайцаў. Ці існуюць арганізацыі, адбываюцца сустрэчы, вядзецца нейкая дзейнасьць?

У Ізраілі існуе сыстэма зямляцтваў. Беларускае з усіх зьяўляецца найвялікшым. Завітайце на сайт Аб’яднаньня выхадцаў зь Беларусі ў Ізраілі і пабачыце там і мае працы у беларускай, ангельскай, расейскай мовах:

Мо час напісаць гісторыю эміграантаў зь Беларусі ў Ізраілі?

Тэма гісторыі эміграцыі зь Беларусі чакае свайго часу, і я не сумняюся, што ён надыйдзе. Гісторыя сыходу настолькі вялікая, што мае патрэбу ў калектыўным асэнсаваньні. Але ўсё па чарзе. Цяпер трэба выдрукаваць манаграфію па гісторыі цэнзуры ў Беларусі. Тэма, дзеючыя асобы, сюжэты, падыходы, як і зусім нежартоўныя жарсьці тых часоў, вельмі пазнавальныя.

У адрозьненьне ад маіх папярэдніх манаграфій, гэтая апынулася ў своесаблівым становішчы. Паколькі яна цалкам прысьвечаная беларускай тэме, то яўрэйскія фонды яе фінансаваць ня могуць – няма падставаў. Не зацікаўленыя ў зьяўленьні такой працы і афіцыйныя структуры ў Менску. Мо тут сваё слова скажа беларуская эміграцыя, як думаеце?

Інтэрвію зрабіў Лявон ЮРЭВІЧ

Гуканьне вясны

Заканчэньне з бачыны 2

ными недарэчнасьцямі і шкадаваньнямі, якія хацелася б пакінуць у мінулым годзе, бо гуканьне вясны – гэта заўжды сьвята аднаўленьня пачатку жыцьцёвага цыклу з новымі памкненьнямі, жаданьнямі й марамі.

Хоць сьвята было крыху імправізаваным, і ўдзельнікі падчас сьпеваў вясьнянак не заўсёды траплялі ў тон, але дзякуючы пэдагагічнаму і арганізацыйнаму таленту сп-ні Валянціны Якімовіч, ніводны госьць не застаўся па-за карагодам. Кожны, як мог, прагаляў зімку гучнымі сьпевамі.

Сьвята было яскравым і запамінальным яшчэ і таму, што ўсе былі апранутыя ў народныя строі, якімі большасьць удзельнікаў забясьпечыла нястомная сп-ня Якімовіч.

Напрыканцы сьвята Пятро Рыжы разам з іншымі патапілі ляльку Марэну ў водах Гудзона, што сымбалізавала канчатковае разьвітаньне зь зімою.

Напэўна, веснавыя сілы пачулі заклікі і пажаданьні кожнага з нас, бо, нягледзечы на змрочны ранак, дзень выдаўся сонечным і цёплым.

Хочацца верыць, што нават прыродныя стыхіі спрыяюць агульным шчырым памкненьням і, аб'яднаўшыся ўсе разам, з добрымі думкамі і плянамі, мы знойдзем дапамогу і падтрымку вышэйшых сілаў і здолеем, крыху зьмяніўшыся самыя, тым самым паўплываць на лёс нашай Радзімы.

З заканчэньнем зімы вас, даражэнькія!

Вольга НАВАКОВІЧ



Здымак А. Дубавой.

ЛІСТЫ

Бюлетэнь "Весткі й Паведамленьні" мае сваё некароткае мінулае. Будучы вельмі сьціплым выданьнем, яно зацікаўляла шматлікіх чытачоў.

Першы нумар выйшаў у лютым 1982 году, і цягам наступных 15 гадоў бюлетэнь прадаўжаў выдавацца. У 1997 годзе Алесь Міцкевіч перадаў кіраўніцтва Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА і "Весткі й Паведамленьні" маладому пакаленьню беларусаў, што прыбылі ў Амэрыку, а менавіта Марату Клакоцкаму.

Незадоўга пасьля гэтага Марат пераняў і выданьне газэты "Беларус", у якой на адной старонцы зьмяшчаўся і бюлетэнь "Весткі й Паведамленьні". А ад студзеня 2011 году бюлетэнь ізноў выходзіць асобным выданьнем.

Нягледзячы на сьціпласьць гэтага бюлетэня, ён часта зьмяшчае паважныя і вельмі цікавыя артыкулы. Прыкладам можа паслужыць артыкул "Мае Калядыˮ Вольгі Наваковіч. Яна найбольш трапна ахарактэрызавала каляднае сьвяткаваньне нараджэньня Хрыста.

Яшчэ ў старажытнасьці беларусы цьвёрда трымаліся прынцыпу Божай Праўды. Цьвёрда трымаліся гэтай Праўды і змагаліся са злом і крыўдамі.

А. МІЦКЕВІЧ

Уплаты ў Згуртаваньне Ñêëàäê³ é àõâÿðàâàíüí³:

Г. Дзімітрава-Скачко	50
К. Кабановіч	50
В. Міхайлава	50
Г. Нехнядовіч	50
Д. Патук	50
Н. Піваварчык	50
А. Сарока	50
Д. Шылаў	50
Н. Шылава	50

Усім шчыры дзякуй!

Уплаты ў аддзел шліце на адрас:

P. O. Box 572
New York, NY 10113

Чэкі выпісвайце на імя скарбніцы
Valentina Balashchenko.

*Паважаныя **Г. Дзімітрава-Скачко, І. Каштанава, Ю. Лапіцкая, І. Машкоўская**, калі ласка, паведаміце рэдакцыі вашыя дакладныя паштовыя адрасы.*

Наступны сход

Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня "Пагоня" адбудзецца **ў суботу 14 красавіка 2012 г.**

Месца правядзеньня сходу:

Seafarers and International House
123 East 15th Street
New York, NY 10003.

*Даезд цягнікамі падземкі **L, N, Q, R, W, 4, 5, 6** да станцыі **Union Square**.*

Будынак знаходзіцца адзін блёк на ўсход ад Union Square па 15-й вуліцы на скрыжаваньні з Irving Place.

Сход пройдзе ў памешканьні капліцы на першым паверсе.

Пачатак: **а 6:00-й** вечара.

----

*Аб месцы і часе правядзеньня сходаў ды іншых імпрэзаў, ладжаных Згуртаваньнем, можна даведацца, наведаўшы ў інтэрнэце ўэбстаронку **www.baza-belarus.org***

Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні* :

М. і Т. Белямук	30
М. Данілюк	30
Г. Дзімітрава-Скачко	30
К. Кабановіч	30
М. Клюева	30
В. Міхайлава	30
Г. Нехнядовіч	30
Д. Патук	30
Н. Піваварчык	30
А. Сарока	30
Д. Шылаў	30

Шчыры дзякуй!

*Падпісацца на бюлетэнь могуць усе зацікаўленыя даслаўшы аплату гадавой падпіскі (**$30**) на адрас:*
VIESTKI
P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735
*Чэкі з адзнакаю **"Весткі"** выпісвайце на імя* ***Valentina Balashchenko***
*Падпіску таксама можна аформіць, наведаўшы сайт **www.e-krama.com***
*Эмэйл адрас: **viestki@mail.com***